доступа: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/1756. – Дата доступа: 24.03.2022
5. Могилевский областной театр кукол – русскоязычная труппа в городе Могилев [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://russian-theater.pro/theaters/mogilevskij-oblastnoj-teatr-kukol. – Дата доступа: 10.03.2022.
6. Мокашева, З. М. Брендинг: Учебное пособие / З. М. Мокашева, М. О. Мокашев. – Спб.: Питер, 2011. – 228 с.
7. Пра тэатр [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.teatrkukol.by/istoriya-teatra. – Дата доступа: 10.03.2022.
8. Театр в Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/belarus/social/culture/teatr. – Дата доступа: 10.03.2022.

Лукьянец К.О., студент 205 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Шатило Е.В.,
старший преподаватель

## ТРАДЫЦЫЙНЫ ТЭКСТЫЛЬ У РАДЗІННАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Вывучэнне традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў народа дае магчымасць даведацца пра яго галоўныя каштоўнасці. Традыцыйныя радзінныя звычаі і абрады беларусаў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў уяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне розныя бакі народнай культуры, побыту, філасофіі, рэлігіі, светапогляду і светаўспрымання. Беларус заўсёды імкнуўся жыць у згодзе са сваім

сумленнем, з людзьмі, якія знаходзяцца побач, з навакольным светам. Чалавек выконваў прынятыя ў канкрэтнай мясцовасці абрады і верыў, што гэтым забяспечвае сабе і сваім блізкім шчасце, здароўе, багацце, лад, добры ўраджай.

“Сістэма радзіннай абраднасці фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў, таму ў ёй мы бачым і ўніверсальныя магічныя ўяўленні і сведчанні разумення нашымі продкамі цеснай сувязі паміж зямным жыццём і космасам. Добра захаваліся ў ёй культы продкаў, агню, вады, расліннасці” [6, с.23].

Комплекс традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў складаўся з трох цесна ўзаемазвязаных цыклаў: дародавага, радавога і пасляродавага. У першыя два ўваходзілі звычаі, прадстаўленні, павер’і, абрадавыя дзеянні, накіраваныя на захаванне цяжарнасці і паспяховае завяршэнне родаў. Пасляродавы цыкл, накіраваны на прыняцце нованароджанага ў сямейна-грамадскі калектыў, уключаў у сябе звычаі і абрады адведывання парадзіхі і нованароджанага, выбару кумы, абраду далучэння дзіцяці да хатняга агменю, які папярэднічаў царкоўнаму хросту, а таксама святкавання хрэсьбін, ачышчэння дзіцяці, першага яго пастрыжэння, кроку, слова, з’яўлення першага зуба. Ва ўсіх трох цыклах паганскія, старажытныя элементы былі моцна пераплецены з хрысціянскімі. Пераплецена мінулае і сучаснасць, традыцыі і новаўвядзенні.

Тканыя вырабы заўсёды выконвалі пэўную ролю ў радзільных абрадах. Так навароджанага апраналі ў мятлік, які прадстаўляе сабой кавалак чыстай, мяккай тканіны, або добра паношанага, вымытага, мяккага палатна. У ім робіцца разрэз для прадзявання на галаву дзіцяці. Сшываць у гэтым мятліку нічога не трэба, роўна як не трэба і рукавоў. Такі мятлік апраналі на дзяцей звычайна да 4-6 месяцаў, пасля, калі ён крыху падрастаў, для яго шыліся з палатна ці сітца рубашачкі. Разам з тым, з дня нараджэння і да 6-9 месяцаў немаўля спавіваюць, для чаго выкарыстоўваецца чатырохвугольны кавалак

добра паношанага сукна, даўжынёй з аршын, невялікі белы або каляровы платок і звычайны кушак, які носіцца мужчынамі замест пояса і па мясцоваму называецца спавівач.

З другога або трэцяга месяца дзіцяці на голую галаву апранаецца сшытая па меры галоўкі шапачка або чэпчык. У такой шапачцы і рубашцы дзіця застаецца да той пары, пакуль не навучыцца добра хадзіць і бегаць, пасля гэтага дзяўчынцы на галаву завязваецца хустка, апранаецца кофтачка або станік, на ногі абуваюць панчошкі або чаравічкі, а часцей за ўсё лапцішкі. У хлопчыкаў жа да 2-3 гадоў галаву павязваюць таксама хкстачкай, у асаблівасці, калі дзіця выносяць на адкрытае паветра ў холад або спякоту, паверх доўнай кашулі апранаецца станік, называемы камізэлькай, абутак той жа, што і ў дзяўчынак; порткі пачынае насіць хлопчык з чатырохгадовага ўзросту або ж пазней. Да гэтага ж часу хлопчыкі звычайна насілі кашулю, даўжынёй ніжэй кален.

Дзіця, якое нарадзілася ўкручвалі ў кашулю бацькі, непасрэдна з яго знятую: “каб дзіця было здаровае, не плакала, каб бацька шкадаваў яго. Сімволіка сувязі бацькі з дзіцём выразна выяўлена ў выкарыстанні нясціраннага адзення бацькі для ноunion нованароджанага. Сціраць яго не належыла: “тады змыецца бацькоўская любоў” [5, с.15].

Да хрышчэння (якое імкнуліся правесці як мага хутчэй – у дзень нараджэння або на іншы дзень) рыхтавалі дзіцяці новую кашулю, пялёнку, (звівальнік), хустку і крыжык. Часцей за ўсё гэта рабілі хросныя бацькі.

Асноўнымі тканінамі, якія ўжываліся для народнага сялянскага адзення, былі даматканыя лён і воўна простага палатнянага перапляцення. Асноўнай сыравінай з’яўляліся кудзелістыя расліны і авечая поўсць. Увесь працэс, звязаны з апрацоўкай валокнаў і вырабам тканін, выконваўся ўручную і захаваў у сабе старажытныя рысы, якія знайшлі адлюстраванне ў народным фальклоры. Лён, воўна пэўным чынам апрацоўваліся, падрыхтоўваліся да прадзення. Тонкае, добра выбеленае палатно ўжывалася

для святочнага адзення, грубае палатно з ільняных агёсаў выкарыстоўвалі для падстаў да жаночых кашуляў і паўсядзённага адзення. Матэрыялам для жаночай кашулі служыла тонкае кужальнае палатно. Самую высакаякасную тканіну рабілі для намётак – жаночых галаўных убораў. Ткалі яе ў два ніты з самай тонкай кужальнай пражы, заўсёды старанна адбельвалі [3]. Касцюму і атрыбутам, якія прызначаліся для пэўнага абрадавага дзейства, надавалася шматзначная сімволіка, якая вызначалася светапоглядам.

Акрамя того, што непасрэдна тэкстыльныя вырабы выкарыстоўваліся ў радзіннай абраднасці, трэба адзначыць і шырокае выкарыстанне сімволікі з вобразамі маці і дзіцяці ў народнай творчасці Беларусі. Вобраз маці і дзіцяці іх знакава-сімвалічныя выявы заўсёды сустракаліся ў тканых і вышытых арнаментах [2]. Выява Маці сустракаецца ў трох варыянтах: у выглядзе жаночай постаці, апраўленай гірляндай з зорак і побач схематычна намаляваным дрэвам. Нярэдка выява суправаджаецца знакамі сонца, месяца, агню. Гэтым майстрыхі падкрэслівалі раўназначнасць вобразаў.

Выява Маці-зоркі як сімвал кахання і міласэрнасці вельмі распаўсюджаны ў дэкоры тканых і вышытых вырабаў. У яго аснове ляжыць васьміканцовая зорка, якая абазначае чалавечую асобу. Яе апраўляе гірлянда з кветак, якая падкрэслівае веліч маці, яе асаблівую ролю ў абнаўленні і працягу жыцця. Часам зорка суправаджаецца чатырма крыжыкамі як пажаданнямі дабра і шчасця. Гэта як словы “добры дзень”, “будзьце здаровыя” [3]. Таксама даволі часта васьміканцовая зорка трактавалася як сімвал дзіцяці.

Вобраз Аранты – Маці-Багіні з паднятымі рукамі – добра вядомы ў хрысціянскім мастацтве. У тканых і вышытых вырабах народных майстрых ён ўмоўны, схематычны, але па-свойму велічны і манументальны.

Такім чынам, развіццё і бытаванне беларускага народнага ткацтва адбывалася ў непасрэднай сувязі з сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі ўмовамі.  Тканыя вырабы шырока выкарыстоўваліся у традыцыйнай

радзіннай абраднасці беларусаў, яны мелі сваё рэгламентаванае ўжыванне, выкарыстоўваліся падчас пэўных рытуалаў і часам выраблялiся менавіта для гэтага. Па матывах і элементах арнаментальнага дэкору, па састаўных частках касцюма, спосабу нашэння, па кампазіцыйна-дэкаратыўнаму афармленню, каларыту і арнаментыцы можна было вызначыць, з якой мясцовасці чалавек, якое яго сямейнае становішча, узрост. Народнае ткацтва – бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор – то сімвал. Усе іх не пералічыць, але кожны ўзор мае сваё прызначэнне і назву. Яны могуць сімвалізаваць дабро і прыгажосць, даваць надзею і сілы, выказваць гонар за чалавека і яго працу, увасабляць любоў і павагу да сваіх продкаў і роднай зямлі.

Важнасць працы прадыктавана значнай колькасцю сабранага фактычнага матэрыялу па прыкметах і павер’ях і выкарыстанні ў творчасці, а таксама абумоўлена перспектывай правядзення далейшых даследаванняў. Гэта будзе спрыяць выхаванню павагі да нацыянальных святынь, раскрывае сутнасць беларускага ладу жыцця, багаты свет традыцый нашага народа, выхоўвае патрыятычныя пачуцці, любоў да вялікай і малой радзімы, пашырае кругагляд, дапамагае ўсвядоміць нормы і ўзоры паводзін у калектыве.

Такім чынам, па традыцыях, якія захоўваюцца ў беларускім касцюме, чытаюцца адбіткі жыцця яго носьбітаў, сямейнае і сацыяльнае становішча. Адзенне – гэта праява матэрыяльнай культуры, крыніца па вывучэнню этнічнай гісторыі народа.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларускія народныя абрады. – Мн., 1994. г.
2. Вышыўка [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://polotsk-gpl-shp.vitebsk.by/page/muzej/page/5_Spadchina/index_8.4.html – Дата доступу: 28.02.2022.

3. Зазірніце ў старадаўні куфар! [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/zaz-rn-tse-starada-n-kufar.html – Дата доступу: 28.02.2022.

4. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў / Т.І.Кухаронак. – – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

5. Міцкевіч, А.М. Сямейная абраднасць беларускага народа / А.М.Міцкевіч. – Мн., 1966 г.

6. Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу “Прыкметы і павер’і сямейнай абраднасці” для студэнтаў спецыяльнасці 1- 21 05 01“Беларуская філалогія” / В. С. Новак, А.А. Кастрыца, А.М. Палуян; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 59 с.

7. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. А.С. Фядосік; прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

8. Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі “Народнае мастацтва Беларускага Палесся”: ілюстраваны каталог Віннікава М.М., Богдан П.А.

9. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечная / У.М.Сысоў. – Мн., 1997 г.

10. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989 г.

Лещёва М.П, студент 314 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Котович О.В,
старший преподаватель

## РЫТУАЛЬНЫЯ ВОГНІШЧЫ ЯК СКЛАДОВАЯ БЕЛАРУСКІХ АБРАДАЎ